РАДАСНАЯ ВЕСТКА

БССР, САВЕТА МІНІСТРАЎ БССР І БЕЛСАЎПРОФА

НАШ УНІВЕРСІТЭТ УЗНАГАРОДЖАН ПАМЯТНЫМ СЦЯГАМ ЦК КПБ, ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР, САВЕТА МІНІСТРАЎ БССР І БЕЛСАЎПРОФА

У азнаменаванне поспехаў у падрыхтоўцы высококваліфікаваных спецыялістаў і навуковых даследаваннях, улічваючы вялікі ўклад у камуністычнае будаўніцтва і выкананне сацыялістычных абавязацельстваў у гонар 50-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі, ЦК КПБ, Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР, Савет Міністраў БССР і Белсаўпроф 16 снежня 1968 года ўзнагародзілі наш універсітэт памятным сцягам.

ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА
ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 36 (727) ● Пятніца, 21 снежня 1968 г. ● Год выдання XXII Цана 2 кап.

Схіліліся над прыборамі два неразлучныя сябры. Пройдзе некалькі хвілін, і яны запішуць у свае канспекты новыя даныя аб электрычнасці.

На здымку: студэнты фізічнага факультэта Валерый Драпеза і Чан Дык Квы праводзяць чарговы доследа.

З ДНЁМ НАРАДЖЭННЯ!

Аб'яўлен агляд-конкурс работ маладых вучоных па грамадскіх навуках, прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна.

ВАША СЛОВА, МАЛАДЫЯ ДАСЛЕДЧЫКІ!

Выкананне рашэнняў партыі і ўрада аб паляпшэнні падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі і Пастановы ЦК КПСС «Аб мерах па далейшаму развіццю грамадскіх навук і павышэнні іх ролі ў камуністычным будаўніцтве» забяспечваюць удасканаленне вучэбнага працэсу ў вышэйшай школе, новыя поспехі ў марксісцкай загартоўцы і камуністычным выхаванні студэнцкай моладзі. Адзначаючы важную ролю моладзі ў здзяйсненні рашэнняў партыі, а таксама ў мэтах стымулявання даследаванняў маладых вучоных у галіне сучаснага грамадскага развіцця, сакратарыят Анадэміі навук СССР і калегія Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі прынялі пастанову аб правядзенні ў 1968—1969 гг. Усесаюзнага агляду-конкурсу работ маладых вучоных па грамадскіх навуках, прысвечанага 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна. У сувязі з гэтым бюро ЦК ЛКСМ Беларусі, Прэзідыум АН БССР і калегія Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР аб'явілі рэспубліканскі агляд-конкурс.

У конкурсе могуць удзельнічаць маладыя навуковыя супрацоўнікі, выкладчыкі, аспіранты, калектывы аўтараў, выконаўшыя планавую або няпланавую работу, аўтары кніг, брашур, артыкулаў, вучэбна-метадычнай літаратуры па марксісцка-ленінскай філасофіі, навуковаму камунізму, палітычнай эканоміі, гісторыі КПСС, гісторыі ВЛКСМ, міжнароднага маладзёжнага руху і маладзёжнай праблематыцы.

Конкурс праводзіцца ў два этапы: першы — да першага лютага 1969 года (працы абмяркоўваюцца на вучоных саветах, паседжаннях кафедр, камітэтаў камсамола), другі закончыцца правядзеннем рэспубліканскай канферэнцыі маладых вучоных і выкладчыкаў па грамадскіх навуках у маі 1969 года ў горадзе Мінску.

ДА ЎСІХ ВУЧОНЫХ МІНСКА І РЭСПУБЛІКІ

ЗВАРОТ ЧЛЕНАЎ ТАВАРЫСТВА «ВЕДЫ» БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

У сувязі з падрыхтоўкай да святкавання 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна мы, прафесары і выкладчыкі Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, звяртаемся да ўсіх вучоных Мінска і рэспублікі з заклікам разгарнуць шырокую прапаганду ленінскіх ідэй сярод працоўных.

Імя Леніна бясконца дарагое кожнаму з нас. З ім мы звязваем свае самыя патаемныя думкі, творчыя планы, усю сваю дзейнасць.

Бессмяротныя ленінскія ідэі аказвалі і працягваюць аказваць глыбокі ўплыў на ўвесь ход сусветнага развіцця. Імя Леніна асабліва дарагое для прафесарска-выкладчыцкага саставу, студэнтаў, аспірантаў, рабочых і служачых універсітэта. Наш універсітэт носіць імя правадыра. Нараджэнне Белдзяржуніверсітэта звязана з імем Леніна.

Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Савецкага Саюза ў сваёй пастанове «Аб падрыхтоўцы да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна» заклікаў савецкі народ адзначыць гэты знамянальны юбілей новымі перамогамі ў барацьбе за ператварэнне ў жыццё планаў камуністычнага будаўніцтва, вызначаных Праграмай КПСС, рашэннямі XXIII з'езда партыі.

Савецкія людзі, выказваючы сваю глыбокую любоў да Ільіча і вернасць яго запаветам, шырока разгарнулі сацыялістычнае спаборніцтва за дастойную сустрэчу 100-годдзя з дня нараджэння. Удасканальваючы навукова-даследчую і вучэбна-выхаваўчую работу, мы павінны выхоўваць моладзь у духу вернасці ленінізму, у духу беззапаветнай барацьбы за вялікія ідэалы камуністычнай партыі, у духу непрымірымасці да ворагаў сацыялізма, падкопаў буржуазнай ідэалогіі і імперыялістычнай рэакцыі. Гэта наша агульная справа, наш агульны абавязак. Ні адзін вучоны не можа стаяць у баку ад гэтай работы.

У перыяд падрыхтоўкі да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна мы абавязуемся:

прачытаць сіламі вучоных Белдзяржуніверсітэта не менш 2.000 лекцый, якія раскрываюць ролю У. І. Леніна як вялікага мысліцеля і рэвалюцыянера, барацьбу партыі за ператварэнне ў жыццё яго вялікіх запаветаў;

арганізаваць не менш 30 калектыўных выступленняў вучоных на прамысловых прадпрыемствах;

аказаць дапамогу ў стварэнні і рабоце «Ленінскага універсітэта» ў клубе «Будмантажіндустрыя»;

падрыхтаваць не менш 200 студэнтаў для чытання лекцый па ленінскай тэматыцы;

арганізаваць ленінскія чытанні на аўтазаводзе, трактарным, заводзе імя Кастрычніцкай рэвалюцыі, заводзе імя Кірава, аўтаматычных ліній, ГПТУ-77, у Оперным тэатры, Палацы культуры прафсаюзаў, у горадзе Барысаве, гарадскіх пасёлках Чэрвень, Смалявічы, Жодзіна, у Акруговым Доме афіцэраў, а таксама выступленні вучоных па радыё і тэлебачанню.

Шырокі ўдзел вучоных у лекцыйнай рабоце значна павысіць узровень прапаганды ленінскай тэарэтычнай спадчыны.

ПРАЎЛЕННЕ.

ЗАЎЖДЫ НА ПЯРЭДНІМ КРАІ

Калектыў універсітэта ўрачыста адзначае 60-годдзе з дня нараджэння і саракагоддзе навуковай, педагагічнай і грамадскай дзейнасці члена-карэспандэнта Акадэміі педагагічных навук СССР прарэктара Сцяпана Андрэевіча Умрэйкі.

Сын селяніна-бедняка з Капыльшчыны, ён прайшоў вялікі і нялёгкі шлях камсамольскага работніка, журналіста, настаўніка, камандзіра-франтавіка, арганізатара народнай асветы на Беларусі, вучонага. Прызнаннем заслуг у развіцці тэорыі і педагагічнай практыкі было выбранне яго членам-карэспандэнтам Акадэміі навук СССР. Ведучы вялікую навукова-даследчую і педагагічную работу, Сцяпан Андрэевіч як прарэктар аддае многа сіл, увесь свой багаты жыццёвы вопыт і здольнасці далейшаму удасканаленню падрыхтоўкі і выхавання высококваліфікаваных спецыялістаў — актыўных будаўнікоў камуністычнага грамадства.

Камуністычная прынцыповасць, партыйная сумленнасць, удумлівасць і смеласць вучонага і таленавітага арганізатара здабылі яму вялікі аўтарытэт, павагу і любоў шматтысячнага калектыву універсітэта.

Аляксандру Васільевічу Кірсанаву спаўняецца семдзесят год. Хто ва універсітэце не ведае гэтага надзвычай энергічнага, клапатлівага чалавека! Прарэктар па адміністрацыйна-гаспадарчай частцы, ён многа робіць для ўмацавання і расшырэння вучэбна-матэрыяльнай базы буйнейшай навучальнай установы рэспублікі, забеспячэння належных умоў жыцця і быту студэнтаў, прымае актыўны ўдзел у партыйнай і грамадскай рабоце не толькі універсітэта, але і сталіцы рэспублікі. Ён часты госць воінаў, рабочых прадпрыемстваў, калгаснікаў. Аляксандру Васільевічу, члену партыі з 1922 года, актыўнаму ўдзельніку Айчыннай вайны, ёсць што расказаць і парадаць моладзі. За сорак год ён прайшоў шлях ад чырвонаармейца легендарнай 30-й Іркуцкай дывізіі да генерал-маёра. Высокае званне Героя Савецкага Саюза, шматлікія ордэны і медалі — дастойнае прызнанне і ацэнка Радзімай баявых заслуг храбрага воіна і камандзіра. Нам прыемна адзначыць, што званне Героя Савецкага Саюза ён удастоен пры вызваленні Беларусі, што ўжо ў час працы ва універсітэце яму ўручан другі ордэн Леніна.

Аляксандр Васільевіч Кірсанаў аддаў многа сіл выхаванню беларускага студэнцтва, будучы загадчыкам кафедры універсітэта. Ён і цяпер на пярэднім краі, сапраўды на баявым пасту.

КАЛЕКТЫЎ УНІВЕРСІТЭТА САРДЭЧНА ВІНШУЕ ЮБІЛЯРАЎ СЦЯПАНА АНДРЭЕВІЧА УМРЭЙКУ І АЛЯКСАНДРА ВАСІЛЬЕВІЧА КІРСАНАВА І ЖАДАЕ ІМ НОВЫХ ПОСПЕХАЎ У ПРАЦЫ І ШЧАСЛІВАГА ДАЎГАЛЕЦЦЯ!

СТАРОНКІ УНІВЕРСІТЭЦКАГА ЖЫЦЦЯ—

ЮБІЛЕЙНАЯ СПРАВАЗДАЧА ВУЧОНЫХ

Закончылася навуковая сесія прафесарска-выкладчыцкага саставу універсітэта, прысвечаная 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі. На пленарным пасяджэнні і ў секцыях было заслухана і абмеркавана звыш ста дакладаў і паведамленняў. Вучоныя падвялі вынікі сваёй працы і абагульнілі дасягненні беларускай навукі за 50 год.

На гэтай старонцы мы расказваем аб рабоце некаторых секцый.

НА ЗДЫМКАХ М. Нічыпарэнкі і М. Серагодскага — у залах пасяджэнняў секцый біялагічных і хімічных навук.

НАПЯРЭДАДНІ ВЯЛІКІХ УРАЧЫСТАСЦЕЙ

У савецкіх людзей стала традыцыяй: напярэдадні вялікіх урачыстасцей нашай Радзімы падводзіць вынікі пройдзенага шляху, каб вызначыць перспектывы далейшай работы.

Калектыў біялагічнага факультэта імкнецца дастойна адзначыць нацыянальнае свята — 50-годдзе БССР і КПБ і свята ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва — 100-годдзе з дня нараджэння У. І. Леніна.

У гэтыя дні на ўсіх кафедрах афармляюцца фотавітрыны і стэнды, якія расказваюць аб развіцці навуковай, вучэбнай і выхаваўчай работы за гады іх існавання. Кожны супрацоўнік падводзіць вынікі ўзятых на сябе абавязацельстваў па навуковай і педагагічнай рабоце ў гонар гэтых знамянальных дат.

У пачатку снежня перад супрацоўнікамі і студэнтамі факультэта выступіў з дакладам «Ленін і біялогія» акадэмік П. Ф. Ракіцкі. Гэтай лекцыяй былі распачаты юбілейныя чытанні, прысвечаныя стагоддзю з дня нараджэння вялікага Леніна.

11 і 12 снежня праходзіла юбілейная навуковая сесія супрацоўнікаў, аспірантаў і студэнтаў факультэта, прысвечаная 50-годдзю БССР і КПБ. Работай секцыі кіраваў акадэмік АН БССР П. Ф. Ракіцкі. Былі заслуханы чатыры аглядныя даклады, якія абагульнялі дасягненні асобных біялагічных навук у БССР і СССР за апошняе пяцігоддзе. Гэтыя дасягненні сапраўды вялікія і сімвалічныя, таму што да рэвалюцыі ў Беларусі не было ні адной установы, якая займалася б распрацоўкай біялагічных праблем, і работу, вядома, трэба было пачынаць з нічога.

На сесіі выступіў дэкан, дацэнт П. Р. Пятровіч, які адзначыў ролю біялагічнага факультэта ў развіцці біялагічнай адукацыі ў Беларускай ССР.

Л. ШКЛЯРОЎ,
асістэнт.

АРГАНІЗАВАНА, НА ВЫСОКІМ УЗРОЎНІ

З вялікай увагай былі праслуханы даклады, прачытаныя на пасяджэннях секцыі хімічных навук юбілейнай сесіі, прысвечанай 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі.

Усе даклады заключаюць несумненную навуковую цікавасць. Прафесар Г. А. Старобінец, дацэнты І. Ф. Кананюк, О. Р. Скараход, А. А. Вечар, А. І. Чырко, Г. А. Браніцкі і іншыя абагульнілі вынікі даследаванняў, якія былі зроблены імі сумесна з іншымі супрацоўнікамі на працягу некалькіх апошніх год па актуальных напрамках хімічнай навукі, такіх, як з'явы іённага абмену і малекулярнай сорбцыі на іённаабменных смолах з розных асяроддзяў, тэорыі будовы, рэакцыйнай здольнасці і механізма хімічных рэакцый, атрыманне новых матэрыялаў і даследаванне іх фізіка-хімічных уласцівасцей.

У дакладах прыведзен шэраг новых даных, выказаны погляды і канцэпцыі на механізм хімічных рэакцый, якія ўяўляюць значную цікавасць для развіцця тэарэтычных поглядаў у галіне хімічнай навукі.

Вывады вучоных заключаюць несумненную практычную цікавасць.

Пасяджэнні секцыі праходзілі арганізавана, і вынікі яе работы маюць вялікае значэнне.

І. ЦІШЧАНКА,
кіраўнік секцыі,
прафесар.

ЗА КОМПЛЕКСНЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ

У дні юбілейнай навуковай сесіі на секцыі геолага-геаграфічных навук праслухана сем дакладаў. Аб вывучэнні азёр БССР расказаў прафесар В. Р. Заурыеў. Ён паведаміў аб выніках даследаванняў, якія праводзіліся ў лімналагічнай лабараторыі пад кіраўніцтвам дацэнта О. Ф. Якушкі. У выніку вывучаны многія азёры Беларусі, іх марфалогія і генезіс, водны рэжым, донныя асадкі і ўздзеянне гэтых фактараў на ўмовы існавання і развіцця арганізмаў. У многіх азёрах знойдзена шмат мінеральных і арганічных рэсурсаў, якія прадстаўляюць дзяржаўны інтарэс.

Значныя поспехі ў вывучэнні тапанімікі БССР адзначыў дацэнт В. Л. Жучкевіч. Акрамя географаў, у распрацоўцы гэтай галіны ведаў зацікаўлены этнографы, гісторыкі, філолагі, і таму кожная праца сустракаецца з вялікай цікавасцю. Сярод надрукаваных работ значнае месца займаюць артыкулы і манаграфіі дакладчыка.

Вынікі дасягненняў беларускай тапанімікі былі падведзены на рэспубліканскай тапанімічнай канферэнцыі, якая праводзілася па ініцыятыве АН БССР, нашага універсітэта і Беларускага геаграфічнага таварыства. У гэтай канферэнцыі прынялі ўдзел таксама прадстаўнікі ўпраўлення геадэзіі і картаграфіі пры Савеце Міністраў СССР.

Развіццю мінеральна-сыравінной базы рэспублікі прысвяціў свой даклад дацэнт Д. М. Карулін. Дакладчык добра расказаў аб дасягненнях беларускіх геолагаў і географаў суседніх рэспублік у правядзенні геолагаразведачных работ і рашэнні геалагічных праблем у Беларусі. Больш падрабязна Д. М. Карулін ахарактарызаваў важнейшыя для БССР выкапні — нафту, каменную і калійную солі, спыніўся на перспектывах адкрыцця прамысловых запасаў жалезных руд і шэрагу іншых відаў мінеральнай сыравіны.

Аб важнейшых дасягненнях у галіне антрапагена БССР, аб ролі геолагаў і географаў універсітэцкіх кафедр і іх выхаванцаў, якія працуюць на вытворчасці, распрацоўцы шэрагу асноўных пытанняў геаморфалогіі і чацвярцічнай геалогіі расказаў дацэнт Л. М. Вазнячук.

У дакладах дацэнтаў В. П. Бародзінай, І. І. Трухана, старшага выкладчыка Н. І. Жураўскай асветлены некаторыя пытанні развіцця і размяшчэння дрэваапрацоўчай прамысловасці ў БССР, лёгкай і харчовай прамысловасці, важнейшыя змены ў размяшчэнні і спецыялізацыі сельскай гаспадаркі Віцебскай вобласці за гады Савецкай улады.

Актыўна прайшло абмеркаванне дакладаў. Прафесары А. Г. Мядзведзеў, В. Р. Заурыеў, В. А. Дзяменцьеў, А. Я. Шкляр, кандыдат навук Ф. С. Фешчанка, дацэнт В. В. Салазанаў, старшыя выкладчыкі В. В. Стэцко, С. Ф. Драко, асістэнт С. С. Каўшэр і іншыя задалі дакладчыкам шэраг пытанняў, якія датычаць далейшай арганізацыі даследаванняў, магчымасцей больш шырокага выкарыстання тэарэтычных вынікаў на практыцы, аховы прыроды і г. д.

У заключэнне старшыня секцыі прафесар В. А. Дзяменцьеў падвёў вынік работы і адзначыў актуальнасць тэматыкі дакладаў, іх мэтанакіраванасць, важнасць вылучаных прапаноў.

Удзельнікі канферэнцыі запэўнілі, што ў сваёй навуковай дзейнасці яны будуць імкнуцца да далейшага развіцця геаграфічных і геалагічных навук з мэтай развіцця народнай гаспадаркі і культуры нашай рэспублікі і ўсёй краіны.

РАСКРЫВАЮЦЦА ТАЯМНІЦЫ НЕТРАЎ

З даклада дацэнта Д. М. Каруліна

У дарэвалюцыйнай Беларусі былі вядомы толькі залежы цагляна-чарапічных глін, будаўнічых пяскоў, торфу, балотных жалезных руд і вапняковай сыравіны. Лічылася, што яе нетры і не маюць колькі-небудзь буйных, значных крыніц мінеральных багаццяў. Такая думка з'явілася вынікам даволі нізкай вывучанасці тэрыторыі Беларусі.

З першых год устанаўлення Савецкай улады арганізуюцца геалагічныя калектывы, і пачынаецца планамернае вывучэнне тэрыторыі рэспублікі. У перадваенныя пяцігодкі геалагічныя і пошукавыя работы ўжо атрымалі шырокае развіццё і дасягнулі асаблівага размаху ў апошняе дзесяцігоддзе. У іх выніку на ўсёй тэрыторыі сярод адкладанняў кайназойскага ўзросту адкрыты шматлікія месцанараджэнні лёгкаплаўкіх, тугаплаўкіх і вогнетрывалых глін, будаўнічых, сілікатных, фармовачных і шкляных пяскоў, пясчана-гравійна - галечнікавых матэрыялаў і залежы бурых вугалёў. У таўшчыні мелавых і дэвонскіх адкладанняў, якія выступаюць недалёка ад паверхні, адкрыты новыя месцанараджэнні лёгкаплаўкіх і мергельна-мелавых парод. У цяперашні час устаноўлена больш 1000 месцанараджэнняў у прыпаверхнаснай частцы тэрыторыі БССР.

Сярод адкладанняў палеазойскага ўзросту, якія залягаюць на вялікіх глыбінях у Прыпяцкай упадзіне, адкрываюцца месцанараджэнні каменнай і калійнай солі, каменнага вугалю, гаручых сланцаў, нафты і газу.

Аднак глыбінныя нетры Беларускай ССР яшчэ толькі раскрываюцца. Абапіраючыся на дасягнутыя поспехі, мінеральна-сыравінная база рэспублікі расшыраецца за кошт усё новых відаў карысных выкапняў і сярод іх за кошт руд чорных і каляровых металаў.

НАФТА І ГАЗ. Упершыню нафта з глыбінных нетраў Беларусі была атрымана на поўдні Гомельскай вобласці, недалёка ад Ельска, у 1953 годзе. Аднак першыя залежы з прамысловымі запасамі нафты былі знойдзены на поўначы гэтай вобласці восенню 1964 года, недалёка ад Рэчыцы.

Багатыя прытокі нафты ў першых свідравінах сведчылі аб вялікіх запасах. Гэта дазволіла разам з разведачнымі работамі ўжо ў сакавіку 1965 года уключыць свідравіны ў пробную эксплуатацыю. Рэчыцкая нафта ўлілася ў магістральны нафтаправод «Дружба», які перакачвае волжскую нафту ў брацкія сацыялістычныя краіны. У першы ж год эксплуатацыі было атрымана каля 40 тысяч тон беларускай нафты.

На працягу 1965—1966 гг. узмоцнена працягваліся разведачныя работы па акантурванню і вызначэнню запасаў месцанараджэння.

Адначасова у нафтаправод «Дружба» усё больш магутным патокам пастулала рэчыцкая нафта. У 1966 годзе яе было здабыта каля 200 тысяч тон. К канцу 1967 года у эксплуатацыі знаходзілася ўжо 25 свідравін і здабыта нафты больш 800 тысяч тон. Так Рэчыцкае месцанараджэнне уступіла ў эксплуатацыю.

Другое месцанараджэнне нафты ў Беларусі ў аналагічных геалагічных умовах адкрыта на Асташкавіцкай структуры, размешчанай у 35 км ад Рэчыцкага месцанараджэння.

Напярэдадні 50-годдзя Савецкай улады быў праведзен 35-кіламетровы нафтаправод Асташкавічы—Рэчыца, і, такім чынам, месцанараджэнне было ўведзена ў пробную эксплуатацыю.

Дэталёвая разведка Асташкавіцкага месцанараджэння працягваецца. Па папярэдніх даных, запасы нафты ў гэтым шматпластавым месцанараджэнні некалькі перавышаюць запасы разведанага месцанараджэння.

Адначасова з разведкай адкрываемых месцанараджэнняў узрастаючымі тэмпамі здзяйсняюцца нафтапрамысловыя работы аб'яднаннем «Беларуснафта». У 1968 годзе ў эксплуатацыі знаходзяцца каля 50 свідравін. Запланавана з іх здабыць 1,7 млн. тон нафты. К канцу 1970 года ў эксплуатацыі павінны быць 150—160 свідравін. Агульная гадавая здабыча нафты ў Беларусі да гэтага часу будзе даведзена да 4,5—5 млн. тон.

КАМЕННАЯ СОЛЬ у Беларусі упершыню была ўскрыта на глыбіні 884 метры у 1941 годзе недалёка ад сяла Давыдаўка у Гомельскай вобласці.

У працэсе геолага-пошукавых работ, якія разгарнуліся ў пасляваенныя гады ў Прыпяцкай упадзіне, амаль усе свідравіны ўскрывалі магутную таўшчыню каменнай солі. Цяпер у межах гэтай вялікай упадзіны выяўлены дзве соленосныя таўшчы, якія ўтвараюць Беларускі соленосны басейн.

Максімальная магутнасць солевых пластоў дасягае 3000 і больш метраў. Да 60—65 працэнтаў гэтай таўшчыні складаецца з чыстай каменнай солі. Агульныя запасы Беларускага соленоснага басейна ацэньваюцца многімі трыльёнамі тон.

КАЛІЙНЫЯ СОЛІ. У 1949 годзе недалёка ад вёскі Чыжоўка былога Старобінскага раёна Мінскай вобласці упершыню ў Беларусі былі адкрыты калійныя солі. Пазней тут было разведана Старобінскае месцанараджэнне, якое з'яўляецца адным з буйнейшых у свеце. Агульная магутнасць яго вагаецца ад 250 метраў на захадзе і да 1 000 і больш метраў ва ўсходняй частцы месцанараджэння.

У апошнія гады на тэрыторыі Прыпяцкай упадзіны адкрыты Любанскае і Петрыкаўскае месцанараджэнні калійных солей. На абодвух праводзяцца геолага-разведачныя работы.

Калійныя солі Беларусі ўжо шырока выкарыстоўваюцца ў народнай гаспадарцы. На базе Старобінскага месцанараджэння пабудаваны першы і другі Салігорскія камбінаты па здабычы і вытворчасці мінеральных угнаенняў. Будуецца трэці калійны камбінат і ў стадыі праектавання знаходзіцца чацвёрты камбінат.

У адпаведнасці з народнагаспадарчым планам, у 1966 годзе ў Беларусі было здабыта мінеральных угнаенняў у пераліку на 100-працэнтнае ўтрыманне спажыўных рэчываў 547 тысяч тон, а у 1967 годзе — 1280 тысяч тон. У 1970 годзе на салігорскіх калійных камбінатах павінна быць атрымана 5,3 млн. тон мінеральных калійных угнаенняў, што складае амаль 40 працэнтаў агульнасаюзнай вытворчасці.

Вялікія разведаныя запасы калійных солей у нашай рэспубліцы адкрываюць вялікія магчымасці для развіцця хімічнай прамысловасці. З калійных солей, акрамя угнаенняў, можна атрымаць едкі калій, металічны магній, калійную селітру, берталетавую соль, квасцы і іншыя прадукты хімічнай перапрацоўкі.

У КНІГУ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

Спартыўныя вечары ў нашым універсітэце праводзяцца часта, але гэты быў асаблівы — на ім падводзіліся вынікі XVI спартакіяды і агляду-конкурсу факультэтаў па фізкультурнай рабоце, прысвечанага 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі.

Арганізатарамі і актыўнымі ўдзельнікамі гэтай цікавай сустрэчы былі члены спартыўнага клуба і супрацоўнікі кафедры фізічнага выхавання і спорту. Многія прыйшлі сюды, каб павіншаваць чэмпіёнаў універсітэта — пераможцаў спартакіяды. А імянінніка ў было шмат — асобныя спартсмены, каманды, факультэты.

Універсітэт па праву ганарыцца спартсменамі, якія паспяхова адстойваюць гонар сваёй «альма матэр» не толькі на рэспубліканскіх спаборніцтвах. Так, напрыклад, майстар спорту Віктар Купрэйчык — студэнт журфака — ужо некалькі разоў удзельнічаў у першынстве студэнтаў свету па шахматах. Студэнт трэцяга курса матэматычнага факультэта Ігар Соўпель з'яўляецца прызёрам маладзёжнага першынства Еўропы па лёгкай атлетыцы. Усе мы сочым за ростам маладога універсітэцкага шашыста Анатоля Гантварга, які стаў сур'ёзным праціўнікам чэмпіёна

РАДАСНЫЯ ВЫНІКІ

свету. Можна было б і далей пералічваць прозвішчы вядучых спартсменаў універсітэта, але галоўнае, мабыць, не ў асобных поспехах, а ў той масавасці, якой вызначаецца спартыўная работа ў нашым калектыве. Дастаткова сказаць, што па праграме спартакіяды было праведзена 26 спаборніцтваў па 22 відах спорту, імі было ахоплена 5.546 чалавек. Правядзенне спартакіяды і агляду-конкурсу садзейнічала далейшаму развіццю арганізацыйнай і спартыўна-масавай работы на факультэтах, фізічнай загартоўцы студэнтаў, павышэнню ўзроўню іх спартыўнага майстэрства.

Павіншаваўшы ўдзельнікаў вечара з надыходзячым святам, з поспехамі, старшыня Рэспубліканскага камітэта Саюза спартыўных таварыстваў і арганізацый І. П. Гуцько падрабязна расказаў аб выступленні савецкіх спартсменаў у Мехіка, дзе яму давялося быць у саставе дэлегацыі СССР. Затым старшы выкладчык кафедры В. В. Нікіцін зачытвае загад рэктара БДУ акадэміка А. Н. Сеўчанкі аб узнагароджанні пераможцаў круглагадавой спартакіяды, агляду-конкурсу і шырокага спартыўнага актыву. Ад імя рэктарата узнагароды ўручае загадчык кафедры фізічнага выхавання і спорту В. П. Шапялевіч і старшыня спартыўнага клуба С. В. Макарэвіч.

Вечар закончыўся паказальнымі выступленнямі членаў секцый бокса, самба і гімнастыкі. Ён паказаў, што спартсмены універсітэта ідуць да юбілею рэспублікі і Кампартыі Беларусі з вялікімі падарункамі, поўныя сіл і жадання і далей памнажаць спартыўную славу Радзімы.

В. ЯКАНЕН,
ст. выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту.

В. СВІРКО,
студэнт.

ВІНШУЕМ З УЗНАГАРОДАЙ!

За высокія спартыўна-тэхнічныя вынікі, дасягнутыя ў 1967—1968 годзе, рэктарат узнагародзіў граматамі і каштоўнымі падарункамі прызёра маладзёжнага першынства Еўропы па лёгкай атлетыцы студэнта трэцяга курса матфака Ігара Соўпеля, прызёра першынства Белсавета СДСТ «Буравеснік» па лёгкай атлетыцы студэнта чацвёртага курса фізфака Міхаіла Батурыцкага, чэмпіёна «Буравесніка» па цяжкай атлетыцы студэнта трэцяга курса фізфака Віктара Сасункевіча, чэмпіёна «Буравесніка» па вольнай барацьбе студэнта другога курса фізфака Яўгена Купрына, чэмпіёна БССР па валейболу студэнта трэцяга курса юрфака Аляксандра Ляпковіча, чэмпіёнку БССР па валейболу студэнтку чацвёртага курса матфака Валянціну Трахіменка, чэмпіёнку «Буравесніка» па баскетболу студэнтку чацвёртага курса Ларысу Макрусёву, прызёра першынства «Буравесніка» па баскетболу Аляксандра Малышава, студэнта трэцяга курса фізфака, чэмпіёнку «Буравесніка» па веласпорту студэнтку трэцяга курса матфака Таццяну Пагрэбенка, чэмпіёнку БССР па горналыжнаму спорту студэнтку чацвёртага курса фізфака Наташу Казлову, чэмпіёна свету па шахматах студэнта трэцяга курса журфака Віктара Купрэйчыка, уладальніцу кубка Белсавета СДСТ «Буравеснік», члена зборнай СССР па спартыўнай гімнастыцы студэнтку першага курса фізічнага факультэта Тамару Яфрэменка.

За актыўны ўдзел і дапамогу ў арганізацыі спартыўна-масавай работы ва універсітэце рэктарат узнагародзіў граматамі і каштоўнымі падарункамі вялікую групу выкладчыкаў кафедры фізічнага выхавання і спорту, усіх факультэтаў, супрацоўнікаў, актывістаў і аматараў спорту. Сярод узнагароджаных дэканы А. А. Гусак, П. З. Савачкін, В. А. Шкурко, чэмпіёны універсітэта старшыя выкладчыкі Г. М. Грудо, В. Ф. Кавалёў, У. І. Бычкоў, майстар спорту Г. А. Драбушэвіч, галоўны бухгалтар Э. І. Бяляўскі, асістэнт кафедры тэарэтычнай механікі А. Б. Антаневіч і іншыя — усяго сорак тры чалавекі.

А. ГАЛУБОВІЧ.

ЯШЧЭ АДНА ПЕРАМОГА

На прайшоўшых нядаўна спаборніцтвах па мастацкай гімнастыцы каманда універсітэта заняла першае месца сярод калектываў вышэйшых навучальных устаноў горада Мінска. У асабістым заліку прызёрам стала студэнтка пятага курса хімфака майстар спорту Таццяна Філонава. Другое месца таксама дасталася нашай студэнтцы — будучаму гістарыку майстру спорту Наташы Сакаловай.

Трэнер каманды Марыта Шчарбініна задаволена поспехамі сваіх выхаванак і яшчэ з большай энергіяй узялася за падрыхтоўку каманды да выступленняў на першынствах рэспублікі і Цэнтральнага савета студэнцкага таварыства «Буравеснік».

Віншуючы з перамогай, рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт» жадае спартсменкам новых поспехаў.

НАПЕРАДЗЕ — МАЦНЕЙШЫЯ

Па выніках спартакіяды факультэты занялі наступныя месцы: першымі ідуць матэматычны, гістарычны і фізічны, затым каманда мясцкома, юрыдычны, хімічны, геолага-геаграфічны, біялагічны, журналістыкі і філалагічны факультэты. Характэрна, што амаль у тым жа парадку размясціліся факультэты па выніках агляду-конкурсу, прысвечанага 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі. На першым месцы аказаўся матэматычны факультэт, другое замацавалі за сабой гісторыкі, на трэцім — геолага-геаграфічны факультэт. Далей ідуць юрыдычны, фізічны, хімічны, біялагічны, а факультэты журналістыкі і філалагічны моцна ўтрымліваюць апошнія месцы.

Матэматычны факультэт (дэкан А. А. Гусак, старшыня камітэта фізкультуры студэнт чацвёртага курса А. Лашчанка, адказны за спартыўна-масавую работу старшы выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту В. С. Мурашоў) за першае месца ў аглядзе-конкурсе ўзнагароджан рэктаратам пераходным Чырвоным сцягам і граматай. За першае месца ў круглагадавой спартакіядзе па комплекснаму заліку факультэт удастоен пераходнага прыза і граматы рэктарата.

Гістарычны факультэт (дэкан П. З. Савачкін, старшыня камітэта фізкультуры студэнт чацвёртага курса В. Цітарук, адказны за спартыўна-масавую работу выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту Г. М. Малочка) за другое месца ў спартакіядзе ўзнагароджан пераходным вымпелам і граматай рэктарата. Грамата таксама ўручана яму за другое месца ў аглядзе-конкурсе.

Юрыдычны факультэт (дэкан В. А. Шкурко, старшыня савета калектыву фізкультуры студэнт трэцяга курса Н. Данілаў, адказны за спартыўна-масавую работу выкладчык О. С. Саўнін) і геолага-геаграфічны факультэт (дэкан Н. Т. Рамановскі, старшыня савета калектыву фізкультуры студэнт трэцяга курса В. Ананіч, адказны за спартыўна-масавую работу старшы выкладчык А. С. Ішчанка), падзяліўшы трэцяе і чацвёртае месцы ў аглядзе-конкурсе, узнагароджаны граматамі рэктарата. Граматы ўдастоен таксама фізічны факультэт, які заняў трэцяе месца ў спартакіядзе па комплекснаму заліку.

Дыпломамі першай ступені на матэматычным факультэце адзначаны каманды па валейболу (дзяўчаты), шахматах, шашках, настольнаму тэнісу, гандболу (дзяўчаты), веласіпеднаму спорту і боксу; дыпломамі другой ступені — каманды па лыжнаму спорту, лёгкай атлетыцы ў зімовых умовах, вольнай барацьбе, мастацкай гімнастыцы, футболу, турысцкаму двоеборству і канькабежнаму спорту.

На гістарычным факультэце дыпломамі першай ступені ўзнагароджаны каманды па валейболу (мужчыны), лёгкай атлетыцы і лёгкай атлетыцы ў зімовых умовах, стралковаму спорту; дыпломаў трэцяй ступені ўдастоены калектывы па спартыўнай гімнастыцы, баскетболу і гандболу (дзяўчаты), турысцкаму двоеборству і веласпорту.

Шмат узнагарод на ліку фізічнага факультэта.

Каманды мясцкома па баскетболу і гандболу (мужчыны), фехтаванню і цяжкай атлетыцы ўзнагароджаны дыпломамі першай ступені, а дыпломаў другой і трэцяй ступені ўдастоены выкладчыкі з каманд па спартыўнай гімнастыцы, шахматах, шашках, класічнай барацьбе, валейболу (мужчыны) і кулявой стральбе.

А. РУСАКОВА.

СЕМІНАРЫ, СУСТРЭЧЫ

У групах па ЛФК (лячэбная фізічная культура) быў праведзен семінар па падрыхтоўцы суддзяў па лёгкай атлетыцы. Практычныя заняткі праводзіліся на стадыёне «Дынама». У канцы лістапада на заліковых занятках студэнты паказалі зацікаўленасць і добрыя веды правіл па правядзенню спаборніцтваў па лёгкай атлетыцы. Выдатныя веды паказалі студэнты Л. Мішчанка, В. Святлоў (фізічны факультэт), Е. Чаголіна (матфак), А. Верашчагін хімфак), Л. Рудзь (філфак) і многія іншыя. Звыш 50 чалавек атрымалі званне суддзі па лёгкай атлетыцы.

Трэба адзначыць, што гэта пачатак стварэння афіцыйнай судзейскай калегіі па гэтаму віду спорту у БДУ з саставу груп ЛФК.

***

Нядаўна спартсмены гістарычнага факультэта былі запрошаны на спартыўны вечар у школу № 3 г. Жодзіна. Выехала дэлегацыя ў саставе 30 чалавек: гімнасты, баскетбалісты, валейбалісты і шашысты. Баскетбалісты гістфака выйгралі з лікам 60:28 у зборнай школы. Валейбалістам давялося сустрэцца з камандай Жодзінскага аўтазавода, і яны перамаглі з лікам 2:1.

Кандыдат у майстры студэнт 4-га курса Н. Чалядзюк правёў адначасовую гульню па шашках на 10 дошках.

ТУРКЛУБ АДЗНАЧЫЎ 10-ГОДДЗЕ

Касцёр упарта не «гарэў». Гэта даволі часта бывае і ў паходах, але зараз яго распаліць было вельмі патрэбна. На сцэне ўжо стаяла палатка, каля яе загадчык забеспячэння турклуба А. Сачэк сядзеў на гары рукзакоў і піў чай каля самавара. З некаторага часу самавар стаў неад'емнай часткай інтэр'ера універсітэцкага турклуба, нават і газета носіць назву «Ля самавара».

Зала пачала запаўняцца. А ад вогнішча, утворанага з дапамогай чырвонай тканіны і вентылятара, нават і дыму не было. Але не бяда! Усё роўна на вечары было цёпла. Гэта ж быў першы наш юбілейны вечар — турклубу споўнілася 10 год.

Нягледзячы на такі, здавалася б, юнацкі ўзрост члены клуба паспелі шмат зрабіць. Беларусь нашы турысты выхадзілі ўздоўж і ўпоперак, хоць засталося яшчэ шмат нябачаных цудоўных мясцін, дзе прыйдзецца пабываць.

Былі мы і на Кольскім паўвостраве, і на Каўказе, на Валдаі, у Забайкаллі, на Урале, на Паміры. Гэты спіс можна было б яшчэ прадоўжыць. У 1968 годзе колькасць паходаў дасягнула рэкорднай лічбы — 39...

Юбіляра віншавалі прадстаўнікі камітэта камсамола, турклуба МГІІЯ, А. Фідэнка, адзін з тых, хто стаяў ля калыскі нашага турклуба. Юбіляру паднеслі падарункі.

Адпаведна з асноўнымі запаветамі турызму, у час урачыстасці зрабілі перапынак для падмацавання сіл. Чай з баранкамі, а для жадаючых — манная каша з вялікай колькасцю ізюма. А на сцэне 9 старшынь (цяперашні, А. Люцко, двойчы старшыня) дзялілі святочны торт, упрыгожаны дзесяццю свечкамі. І, вядома, па традыцыі гучалі песні.

Пасля перапынку ўдзельнікам вечара было паказана некалькі зняты х у паходах фільмаў. Алтай, Саяны, беларускае Палессе...

Зала заціхла. Кожнаму, напэўна, прыпомнілася штосьці з перажытага і ўбачанага.

Цяпер набліжаецца сесія, але разам з ёй і доўгачаканы час зімовых паходаў. І няхай у гэтым «адзінаццатым зімовым сезоне»» будзе ў турклубе шмат новых таварышаў, а ў паходзе — выдатная лыжня, добры азімут і добры касцёр.

В. ВАРАЧАЕВА,
студэнтка.

НА ЗДЫМКАХ: універсітэцкія турысты на дарогах Радзімы.

НА КАФЕДРАХ І Ў ЛАБАРАТОРЫЯХ



САДРУЖНАСЦЬ ПАКАЛЕННЯЎ

Адной са старэйшых кафедр нашага універсітэта з'яўляецца кафедра матэматычнага аналізу. Як вядома, матэматычны аналіз з'яўляецца фундаментам усёй матэматычнай навукі. Гэты складаны прадмет па сутнасці суправаджае студэнта з першага да выпускнога курса.

Гадоў дзесяць назад калектыў кафедры быў невялікі, таму і не мог весці грунтоўныя даследаванні па вядучых галінах навукі, не было цеснай сувязі са студэнтамі. І гэта не выпадкова. Цікавасць студэнтаў да глыбокага вывучэння новых і складаных праблем, да самастойнай работы можна развіць цікавымі спецкурсамі і семінарамі. А іх, па сутнасці, не было.

Справы карэнным чынам змяніліся, калі кафедру ўзначаліў вядомы спецыяліст у галіне матэматыкі доктар фізіка-матэматычных навук прафесар Фёдар Дзмітравіч Гахаў, які неўзабаве быў выбран акадэмікам АН БССР. Сваю работу ва універсітэце ён пачаў з актывізацыі навуковых даследаванняў і ўдасканалення вучэбнага працэсу. І тая і другая праблемы патрабавалі высококваліфікаваных кадраў. Поспех прыйшоў не адразу. Акадэмік Ф. Д. Гахаў сваім прыкладам зацікавіваў супрацоўнікаў актуальнымі навуковымі праблемамі. Гэтак жа дзейнічаў ён і ў адносінах да студэнтаў. Успамінаецца такі выпадак. У першы год Фёдар Дзмітравіч распрацаваў і пачаў чытаць складаны спецкурс «Краявыя задачы тэорыі аналітычных функцый». На першую лекцыю прыйшло ўсяго некалькі чалавек, але гэта не збянтэжыла прафесара. Лекцыя адбылася, і аб ёй многа гаварылі на факультэце. На другую лекцыю прыйшлі і выкладчыкі, і студэнты, а хутка кафедры прыйшлося рыхтаваць новы спецкурс. Вакол вучонага згуртавалася вялікая група даследчыкаў, зацікаўленых гэтай тэматыкай. Цяпер ва універсітэце працуе семінар па матэматычнаму аналізу і матэматычнай фізіцы, у якім удзельнічаюць студэнты, стажоры, аспіранты, выкладчыкі не толькі нашага факультэта, але і іншых навучальных устаноў Мінска.

Сапраўды, тут можна бачыць не толькі садружнасць пакаленняў, але і тое, з якой ахвотай старэйшыя перадаюць свае веды, свой вопыт у навуковых даследаваннях маладым і як пачынаючыя паспяхова нясуць наперад эстафету сваіх настаўнікаў.

Вельмі часта ў перапынках можна бачыць сівога прафесара ці акадэміка ў акружэнні студэнтаў або такую карціну — ля дошкі стаіць юнак ці дзяўчына, і іх з увагай слухаюць ужо прызнаныя спецыялісты. У стварэнні гэтай творчай атмасферы таксама вялікая заслуга Фёдара Дзмітравіча Гахава. Ён першы дарадчык і супрацоўнікаў кафедры, і студэнтаў. Чалавек вялікай працаздольнасці, ён умее зацікавіць іншых і заўсёды знойдзе час, каб дапамагчы. Кожны з нас у любы момант ці ва універсітэце, ці дома можа атрымаць карысную параду і неабходную дапамогу. Таму не дзіўна, што кафедра матэматычнага аналізу вельмі хутка вырасла. Цяпер у яе саставе 26 чалавек, з іх пяць кандыдатаў навук, хутка яшчэ тры супрацоўнікі будуць абараняць дысертацыі.

На кафедры прайшоў падрыхтоўку в'етнамец Хоанг Дзінь Зуинг, яго дысертацыя прынята да абароны. Дарэчы, цяпер на кафедры займаецца дзевяць аспірантаў. Гэта не толькі выпускнікі нашага факультэта, але і іншых вну.

Пры кафедры створана навукова-даследчая лабараторыя, у якой малодшыя навуковыя супрацоўнікі і стажоры займаюцца навейшымі пытаннямі тэорыі краявых задач, інтэгральных ураўненняў, матэматычнай фізікі. Супрацоўнікамі лабараторыі ў апошні час атрыманы цікавыя вынікі.

З цягам часу кафедра устанавіла цесныя сувязі з навуковымі цэнтрамі краіны: Казанню, Масквой, Адэсай, Растовам, Кіевам і іншымі. Вучоныя гэтых цэнтраў выступаюць у нас у якасці апанентаў і дакладчыкаў на семінарах, чытаюць лекцыі і спецкурсы для студэнтаў і супрацоўнікаў. Так, за кароткі час ва універсітэце пабывалі вядомыя вучоныя: прафесары Л. І. Чыбрыкава (Казань), Л. Г. Міхайлаў (Душанбе), які прачытаў цікавы спецкурс па інтэгральных ураўненнях і выступіў на абароне дысертацыі аспірантам М. А. Шэшка; прафесар Ю. І. Чэрскі і дацэнт Л. Г. Літвінчук (Адэса), які нядаўна абараніў доктарскую дысертацыю ў нашым універсітэце; прафесар Д. А. Квеселава (Тбілісі), прафесар І. М. Рапапорт (Масква), прафесар У. С. Рагожын (Растоў-на-Доне), дацэнты Л. А. Аксенцьеў, Ю. М. Крыкуноў (Казань), С. Г. Самко (Растоў-на-Доне), П. А. Юраў (Шахты) і іншыя.

Аспірант-завочнік Фёдара Дзмітравіча Гахава Н. В. Говараў прадставіў на нашу кафедру да абароны кандыдацкую дысертацыйную работу, якая вядомымі вучонымі нашай краіны была рэкамендавана да абароны як доктарская і бліскуча абаронена.

Цяпер многія нашы супрацоўнікі выступаюць з дакладамі на навуковых канферэнцыях, сімпозіумах. Да 50-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі ўсе супрацоўнікі кафедры паспяхова выканалі ўзятыя абавязацельствы: дацэнт П. Н. Князеў падрыхтаваў да друку дапаможнік «Перайтварэнні Фур'е». У сааўтарстве з кандыдатам фізіка-матэматычных навук В. І. Азаматавай напісалі кнігу «Кіраўніцтва да рашэння задач па тэорыі функцый комплекснага пераменнага», напісан шэраг каштоўных навуковых артыкулаў. У супрацоўнікаў ёсць многа новых задум і планаў, а таксама магчымасцей для іх здзяйснення.

Ф. ЧУМАКОЎ,
кандыдат фізіка-матэматычных навук.

НА ЗДЫМКУ: акадэмік АН БССР прафесар Ф. Д. Гахаў выступае на секцыі матэматычных навук юбілейнай сесіі.

Фота У. Каліпіна.

Да 170-годдзя з дня нараджэння А. Міцкевіча

НЯЗГАСНЫ СВЕТАЧ

Імя Адама Міцкевіча вядома ўсяму свету. Буйнейшы польскі паэт заваяваў прызнанне прагрэсіўнага чалавецтва сваім талентам, вялікім паэтычным майстэрствам, любоўю да жыцця і простага чалавека.

Адам Міцкевіч наш зямляк. Ён нарадзіўся 24 снежня 1798 года на хутары Заворссе, непадалёку ад Навагрудка. Паэт захаваў на ўсё жыццё цёплыя пачуцці да краю, дзе прайшлі яго маленства і юнацтва. Ён думаў пра Беларусь, па ёй сумаваў у выгнанні, блукаючы на чужыне:

Маленства край! Ты
з намі да сканання—
Чысты, святы, як першае
каханне!

Ад першых юнацкіх балад і рамансаў да велічнай паэмы «Пан Тадэуш» — усюды жыве харство беларускай прыроды, любоў да яе. Гэтая любоў не была абмежаванай і абстрактнай. Конрад, герой паэмы «Дзяды», паднімаецца ў надхмарныя высі, каб здабыць у бога частку яго магутнасці і зрабіць свет шчаслівым. У многіх сваіх творах, у тым ліку ў «Адозве да рускіх», Адам Міцкевіч піша, што дзень падзення дэспатаў будзе першым днём міру і дружбы народаў. Нязгасную любоў польскага паэта да сваёй бацькаўшчыны падкрэсліваў А. С. Пушкін, які быў паланён паэтычным геніем Адама Міцкевіча:

Ён гаварыў аб будучыні
светлай,
Калі народы, звады ўсе
забыўшы,
З'яднаюцца ў вялікую
сям'ю.

Народнасць паэзіі Адама Міцкевіча, глыбіня пранікнення ў душу чалавека працы, глыбокае веданне яго дум і спадзяванняў сапраўды здзіўляюць.

Навагрудчына нарадзіла Адама Міцкевіча вялікім самабытным паэтам. Яна апранула ў непаўторныя паэтычныя шаты яго малады запал, рэвалюцыйны пафас. Раскошныя пейзажы лірычных вершаў, балад, легендарныя вобразы, рэалістычныя фігуры шляхты і прыгоннага сялянства — малюнкі і дзеці фантазіі Міцкевіча, крыніцаю якіх былі ўражанні, што засталіся ад гадоў, пражытых на Беларусі. Даўшы свету цудоўнага паэта, Навагрудчына знайшла ў ім свайго ўдзячнага песняра.

Беларусь ганарыцца Адамам Міцкевічам. Яго кнігі прыйшлі жаданымі гасцямі ў хаты і бібліятэкі, у школы і інстытуты. Мы, беларусы, паведамляем свету, што сцежкі да вялікага паэта не зарастаюць, а з кожным годам робяцца ўсё віднейшымі. Навагрудак — горад легендарнай старажытнасці і новай сцыялістычнай сучаснасці. Сваім выглядам, сваім жыццём ён як бы гаворыць:

Тут жыў Міцкевіч,
Тут яшчэ гудуць
І веюць ветры тыя, што
калісьці
Па свеце неслі хмары яго
дум,
Пад вокнамі яму шумелі
лісцем

Сёння, думаючы і гаворачы пра Адама Міцкевіча, мы бачым у ім аднаго з тых, хто, паказваючы свой час, раскрываючы драматычны змест сваёй эпохі, становіцца вестуном будучыні, нязгасным светачам для новых пакаленняў.

Л. КРУЧКОЎСКІ.

БУДНІ ЖУРНАЛІСТАЎ

Гэта лекцыя адрознівалася ад папярэдніх. Перад заняткамі выкладчык беларускай літаратуры С. Х. Александровіч паведаміў студэнтам другога курса журфака: «Сёння заняткі мы правядзём у музеі Янкі Купалы». Ён жа быў там і ў ролі экскурсавода. Пісьменнік і выкладчык С. Х. Александровіч цікава расказаў аб жыцці Янкі Купалы, аб яго вялікай творчай спадчыне. Хутка такую ж экскурсію студэнты зробяць і ў музей Якуба Коласа.

*

Нядаўна на факультэце журналістыкі адбылася сустрэча з рэдактарамі раённых газет — удзельнікамі нарады-семінара у ЦК КПБ.

У госці да студэнтаў прыйшлі былыя выпускнікі факультэта рэдактары Лідскай і Маладзечанскай раённых газет «Уперад» і «Святло Кастрычніка» А. Богуш і Б. Пернікаў, намеснік рэдактара Іўеўскай раённай газеты «Шлях Ільіча» А. Бяспалы. Яны падзяліліся вопытам сваёй работы ў газетах, далі шэраг карысных парад.

М. БАБОК,
На здымку: дацэнт журфака Р. В. Булацкі выступае перад гасцямі.

Фота І. Аскіркі.

НА ПАДРЫХТОЎЧЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ

Нядаўна в'етнамскія студэнты падрыхтоўчага факультэта былі гасцямі рабочых 11-га Дзяржаўнага падшыпнікавага завода.

Замежным сябрам расказалі аб гісторыі завода, пазнаёмілі з умовамі працы і адпачынку рабочых. Госці пабывалі ў цэхах, дзе пазнаёміліся з вытворчасцю. Сакратар камітэта камсамола Міхалай Хамякоў падрабязна расказаў аб дзейнасці камсамольскай арганізацыі на прадпрыемстве.

***

Замежныя студэнты нашага універсітэта прынялі актыўны ўдзел у вечары, прысвечаным 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі, які праводзіўся у памяшканні Інстытута народнай гаспадаркі імя В. У. Куйбышава. У заключэнне вечара быў дадзен канцэрт пераможцаў студэнцкай мастацкай самадзейнасці на гарадскім аглядзе-конкурсе.

***

З лекцыяй аб нашым універсітэце перад в'етнамскімі студэнтамі выступіла выкладчык Р. А. Міхневіч. Перад лекцыяй адбылася экскурсія па універсітэту, у час якой студэнты наведалі гістарычны і біялагічны музеі, вылічальны цэнтр і лабараторыі фізічнага факультэта.

***

Студсаветы інтэрнатаў №№ 2 і 3 сумесна правялі «Агеньчык», у якім прынялі удзел савецкія і замежныя студэнты. Яны абменяліся думкамі па пытаннях міжнароднага студэнцкага руху. Удзельнікі мастацкай самадзейнасці выканалі савецкія і нацыянальныя песні і танцы.

Калектыў кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў універсітэта выказвае глыбокае спачуванне кандыдату гістарычных навук І. А. Сяргееву з выпадку напаткаўшага яго гора—смерці БАЦЬКІ.

Адк. рэдактар М. І. ІОСЬКА.

АТ 20457 Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон: Б-2-07-19. Тыраж 2000 экз. Зак. 2143.